## БЕЛАРУСКАЯ КРОНІКА.

**Дэлегацыя настаунікаў Навагрудзкага павету.** У. Ц. Раду В. і Грод. прыбыла 22 д. дэлегацыя ад сялян і настаунікау беларусау у справе адкрыцьця беларускіх народных школ.

**Ухіленьне са службы.** Цэнтр. Рада В. і Г. паведамляе, што з урадовых пасад ухіляюцца беларусы-праваслауные. Аб гэтым паступаюць скаргі.

## ...ые навіны.

...золюцыйнай камісіяй пропозыцыю, якая адкідае думку аб выдаленьні 11 дэпутатау, галасаваушых за ваенные крэдыты і агранічваецца выгаварам („Возрождение" №. 63—16·IX.)

**Рэзолюцыі зьезду польскіх соцыялістау у Вільні.**

Зьезд польскіх соцыялістау прыняу, паміж іншымі, гэткіе рэзолюцыі: „Стоячы на грунце самастойнасьці і цэласьці нашага краю, Літвы і Беларусі, які павінен быць у дзяржауна—праунай лучнасьці з Рэччу Паспалітай Польскай, а гэтак сама на грунце самаазначэньня народау, насяляючых наш край—конфэрэнцыя будзе йсьці да скліканьня Установчага Сойму у Вільні, зложанага з прадстаунiку усіх частак Літвы і Беларусі, выбранага на падставе 5-ці членнае формулы у варунках безумоунай свабоды, зазначаючы, што на гэтым Сойме асобные часьці краю ня могуць быць перагаласоуваны праз іншые часьці гэтага краю".

„Конфэрэнцыя прызнае, што натуральные варункі, а гэтак сама і сучасны момэнт ствараюць мажлівасьць рэялізацыі лучнасьці працоунае клясы Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны, Латвіі і Эстоніі, як процістауленьня: экспансіі коленізацыйна-цэнтралістычнай Расіі і Нямеччыны і капіталістычным пакусам Антанты".

...шу вольнасьць".

## МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

**Беларускі хор Цяраускага** адтрымау ад Бел. Нац. Камітэту 3,000 руб. субсыдыі на паездку у концэртнае турнэ да Вільні і Варшавы.

**Прыехау з Варшавы** міністр унутраных спрау Бел. Нар. Рэсп. К. Тэрэшчэнко.

**Пропускі** на выезд у Слуцк (праз ст. Осіповічы і Урэчье) будуць выдавацца у хуткім часе.

**У Консэрваторыі** заняцьці на усіх курсах пачаліся 2-га кастрычніка.

**Тэхнічны аддзел пры вышэйшых курсах** адчыняецца у хуткім часе.

**Недахват царскіх грошай** чуецца у мейсцовых мяняльных крамах і банкірскіх канторах, дзякуючы чаму часта кліенты выходзяць адтуль с пустымі рукамі.

**Бонавые карткі** (бальшавіцкіе) па якім насяленьне адтрымоувало прадукты, трэба цяпер абменіваць на кніжкі (Катэдральны пляц, № 2).

**Хлеб** апошнімі днямі прадаецца па 2½ р. за фунт.

**Малако** на рынку прадаецца па 2 р. за кварту.

**Бярозавые дровы** прадаюцца на рынках па 160—200 руб за воз.

**Масло** прадаецца цяпер ка 25—20 р. ф.

**Цукер** (у кавалках) у прыватнай прадажы дайшоу да 57 р. фунт.

Мае прыбыць сюды вялікая партыя (10,000 пуд.) цукру з Голяндыі па таннай цане—5 гол. марак за кіло (2½ фун.).

**Крываука.** У зьвязку з пашыраючайся эпідэміяй крываукі (дезынтэрыі) падаецца да агульнага ведама:

**Аб гандлю зелянінаю і садавінамі.**

1. Гандляваць зелянінай і садавінамі можна толькі у спэцыяльна прызначаных дзеля гэтага мейсцох; 2. зеляніна і садавіны прадаюцца з прырыхтаваных дзеля гэтага сталоу, лавау, полак і т. д.; 3. Прадаваць зеляніну і садавіны раскіданые на зямлі срога забараняецца; 4. Садавіны і зеляніна перад прадажаю павінны быць добра абмыты; 5. Прыпсутые і нясьпелые садавіны і зеляніну прадаваць срога забараняецца; 6. Асобы, правініушыеся у невыканаіньні гэтае абавязковае пастановы, будуць карацца 7-мі дзенным арэштам або штрафам у 500 руб.

Загадчыца мястовым Аддзелам абароны здароуя, Лаунік Магістрату Д-р. **М. Петрусевіч.**

*Рэдактар-выдавец*
*Ядв. ЛУЦЭВІЧ.*

Друкарня Інвалідау, Менск.